Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-10-18

# Сын Беларусі і Украіны

***9 кастрычніка Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь чакаў гасцей на адкрыцці выстаўкі «Піліп Орлік – аўтар першай украінскай канстытуцыі», якая была прымеркаваная да 340-годдзя з дня нараджэння П. Орліка.***

***Ён быў гетманам Правабярэжнай Украіны, сцвярджаў права ўкраінцаў на ўласную краіну і прыкладаў вялікія намаганні, каб аб'яднаць яе.***

***А з Беларуссю Орліка яднае тое, што нарадзіўся і вырас ён на Вілейшчыне.***

– Вілейская зямля падарыла нашай роднай сястры Украіне такога чалавека, як Піліп Орлік, таму мы ў пэўнай ступені з'яўляемся вінопунікамі сённяшняй урачыстасці, – зазначыла Святлана Дзяруга, намесніца старшыні Вілейскага райвыканкама.

На выстаўцы, разам з партрэтамі ўсіх гетманаў Украіны, змешчаныя фотаздымкі, што расказваюць пра ўвекавечванне памяці П. Орліка. У вёсцы Касута, дзе нарадзіўся славуты дзеяч, была адрэстаўраваная каплічка, а неўзабаве будзе створаны музей у гонар вялікага земляка. Яшчэ ў Касуце ўсталяваная мемарыяльная дошка са шматспадзеўным надпісам «Тут будзе помнік Піліпу Орліку». Хочацца верыць, што ён сапраўды будзе.

У адкрыцці выстаўкі ўдзельнічалі таксама намеснік дырэктара музея па навуковай працы Ніна Калымага, дарадца па пытаннях культуры Амбасады Украіны Васіль Бондар, дацэнт кафедры гісторыі Расіі БДУ Святлана Лугаўцова. І ледзьве не кожны з выступоўцаў казаў пра Галіну Калюжную, старшыню Мінскага гарадскога аб'яднання ўкраінцаў «Запавіт». Дзякуючы яе намаганням ды энтузіязму і адбылася гэтая выстаўка. Жвавая, рухавая, з агеньчыкам у вачах, яна напоўніцу апраўдвала свой тытул «вечнага рухавіка ўкраінскай дыяспары ў Беларусі» – менавіта так называлі Галіну Яфімаўну тыя, хто яе ведае. А прафесар Алег Яноўскі адзначыў: «Калі звоніць мой тэлефон і я чую голас Галіны Яфімаўны, то ведаю: ёсць ідэя. Трэба яе працягваць, трэба нешта рабіць, каб гэтую задуму рэалізаваць. Заўсёды яна сваім натхненнем, сваёй крэатыўнасцю рухае справу».



В. Бондар



Г. Калюжная

А дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Вячаслаў Даніловіч слушна адзначыў: «Можна доўга пералічваць тых асоб і тыя падзеі, якія звязваюць гісторыю беларускага і ўкраінскага народаў. Але больш важна, каб мы памяталі пра гэта, каб заўсёды падтрымлівалі адно аднаго. І адкрыццё выстаўкі – гэта даніна павагі да нашай агульнай мінуўшчыны. І яшчэ адна нагода ўспомніць пра тое, што нас звязвае, а не раз'ядноўвае».

**Ніна КАЗЛЕНЯ,**
**студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ**
**Фота аўтара**

Ніна Казленя. Сын Беларусі і Украіны